Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

15 чэрвеня 2015 года, № 11 (2135)

Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

ПАДЗЕЯ

Прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы – ганаровы прафесар нашага ўніверсітэта

У БДУ адкрыта галерэя, прысвечаная вядомым дзеячам, якія зрабілі ўнёсак у развіццё сусветнай палітыкі і навукі. Першым у сувязі з візітам прэзідэнта Індыі ва ўніверсітэцкім дворыку ўсталяваны бюст Махатму ГАНДЗІ.

Прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы ўпершыню наведаў Беларусь. Гэта вялікая палітычная падзея не абышла і наш універсітэт. Ва ўрачыстай атмасферы 3 чэрвеня адбылося адкрыццё помніка Махатму Гандзі – нацыянальнаму герою Індыі, вядомаму заснавальніку мірнага руху за незалежнасць краіны. Рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка адзначыў: «Гэтым помнікам адкрываецца галерэя, прысвечаная выбітным дзеячам, якія паўплывалі на ход сусветнай палітыкі і развіццё навукі».

У сваёй прамове Пранаб Мукерджы таксама падкрэсліў, што імя лідара нацыянальна-вызваленчага руху Індыі Махандаса Карамчанда Гандзі асабліва шануецца ва ўсім свеце. Пад яго кіраўніцтвам у 1947 годзе краіна здабыла незалежнасць. Гандзі выступаў супраць рэлігійных звад і гвалту. Жыццёвая філасофія Гандзі здабыла яму ўсенародную любоў і шанаванне не толькі ў суайчыннікаў.

На ўрачыстым сходзе прэзідэнт Індыі быў удастоены звання ганаровага прафесара БДУ. Дыплом Пранабу Мукерджы ўручыў рэктар акадэмік Сяргей Абламейка. Такой узнагародай індыйскі дзяржаўны дзеяч ушанаваны за вялікі асабісты ўнёсак ва ўмацаванне і развіццё ўсебаковых сяброўскіх адносін паміж Індыяй і Беларуссю.

Нагадаем, дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Індыяй усталяваны ў 1992 г. Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка наведваў Індыю з дзяржаўнымі візітамі ў 1997 і 2007 гг. Гандлёва-эканамічныя сувязі дзвюх краін характарызуюцца дынамічным развіццём: аб'ём беларуска-індыйскага гандлю ў 2014 г. склаў $ 402,7 млн, уключаючы беларускі экспарт у памеры $ 215,1 млн, тэмп росту – 103,5 %. На індыйскі рынак пастаўлена прадукцыя 72 найменняў. Індыя з'яўляецца адным з найважнейшых гандлёвых партнёраў Беларусі ў азіяцкім рэгіёне. Беларускі экспарт у Індыю традыцыйна дамінуе над імпартам. Наша краіна экспартуе калійныя ўгнаенні, вялікагрузныя аўтамабілі, жгут сінтэтычных нітак, падшыпнікі і інш. А імпартуе з Індыі лекі і фармацэўтычныя субстанцыі, тытунёвую сыравіну, гарбату, вострыя прыправы, арэхі, алеі...

Фота Васіля СЯМАШКІ

Напярэдадні візіту прэзідэнта Індыі ў сценах БДУ былі падпісаны 7 мемарандумаў аб супрацоўніцтве паміж вышэйшымі школамі Беларусі і Індыі. У нашай краіне ў сапраўдны момант вучацца 138 індыйскіх студэнтаў.

Жанна ВАСАНСКАЯ

У нумары:

РАСПАВЕСЦІ СВЕТУ ПРА БЕЛАРУСЬ
Гутарка з намеснікам дэкана ФДА Аляксандрам ЖУКОМ пра экспарт адукацыйных паслуг у Турцыю і Паўднёвую Карэю
Стар. 2

КАРТУ З ІНТЭЛЕКТАМ ПРЭЗЕНТАВАЛІ Ў БДУ
Супрацоўнікі ўніверсітэта атрымаюць пасведчанні з пашыраным функцыяналам
Стар. 3

ПЛАТОН ІМ СЯБАР...
Размова з дацэнтам ФФСН Андрэем ДУДЧЫКАМ з нагоды ўдзелу нашых студэнтаў у міжнароднай алімпіядзе па філасофіі
Стар. 4

Весткі з рэктарата

РАСПРАЦОЎКІ БДУ былі прадстаўлены ў Нацыянальнай бібліятэцы на выставе айчынных навукова-тэхнічных тавараў і тэхналогій у рамках Беларуска-індыйскага бізнес-форуму. БДУ прадэманстраваў нанаспадарожнікі і касмічныя даследаванні; вымяральны комплекс Alma-Meter; імпульсныя крыніцы электрасілкавання; тэрмаўстойлівыя кампазіцыйныя матэрыялы; вырабы з поліўрэтанаў; водаачыстнае абсталяванне – установку МАВОУ; спірометр МАС-1; лекавыя прэпараты і інш.

* * *

ЧАТЫРЫ пратаколы пра намеры падпісаў БДУ з кампаніямі Азербайджана падчас XXI Міжнароднай выставы харчовай прамысловасці WorldFood, якая завяршылася 23 мая ў Баку. Мяркуецца супрацоўніцтва ў галіне вытворчасці сарбентаў і дэзінфекцыйных сродкаў і павышэння эфектыўнасці кропельнага арашэння. Дэлегацыя БДУ правяла 40 перамоў з замежнымі кампаніямі, якія выявілі вялікую цікавасць да навукова-тэхнічных распрацовак БДУ: ветэрынарных прэпаратаў, узбагачальных фітакампазіцый, вітамінна-мінеральных прэмікса для харчовай прамысловасці, дэзінфекцыйных сродкаў. Больш за 20 інавацый БДУ былі прадстаўлены на агульным стэндзе Беларусі.

* * *

СТАРШЫНЁЙ савета старастаў БДУ абрана другакурсніца хімічнага факультэта Ксенія Валністая. Перад студэнцкім актывам са справаздачай пра зробленую працу выступіў экс-старшыня савета старастаў Канстанцін Жук. Начальнік управлення выхаваўчай работы з моладдзю Аляксей Багамазаў падзякаваў студэнцкім лідарам за грамадскую якасную працу, а таксама запэўніў, што супрацоўнікі УВРМ заўсёды падтрымліваюць моладзевыя ініцыятывы і дапамагаюць арганізатарам.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Турцыя – Паўднёвая Карэя,

альбо Некалькі спосабаў распавесці свету пра Беларусь

Беларуска-турэцкі інфармацыйна-адукацыйны цэнтр створаны факультэтам даўніверсітэцкай адукацыі БДУ ў г. Анталія (Турэцкая Рэспубліка) на базе турэцкага прадпрыемства «Cenk Sarkut can aktif yurt disi egitim danismanligi».

Дырэктар беларуска-турэцкага цэнтра Джэнк Саркут і Аляксандр Жук разам з турэцкімі студэнтамі – слухачамі курсаў рускай мовы ФДА

У адкрыцці бралі ўдзел першы сакратар пасольства нашай краіны ў Турцыі Уладзімір Салаўёў і прадстаўнікі турэцкага турыстычнага бізнесу. Дэлегацыю БДУ ўзначаліў намеснік дэкана факультэта даўніверсітэцкай адукацыі Аляксандр ЖУК, які распавёў нам пра сітуацыю на рынку адукацыйных паслуг і падыходы ФДА па прыцягненні замежных абітурыентаў.

– Наш факультэт зацікаўлены ў павелічэнні экспарту адукацыйных паслуг і спрабуе прыдумаць розныя ідэі, варыянты, як прыцягнуць замежных студэнтаў на навучанне ва ўніверсітэт. Галоўным чынам мы працуем з кампаніямі, якія займаюцца рэкрутынгам замежнікаў. Да дадзеных кампаній прад'яўляюцца пэўныя патрабаванні па якасці накіраваных на навучанне студэнтаў, па выкананні імі па прыездзе заканадаўства Рэспублікі Беларусь. З Турцыі было шмат ахвотнікаў, якія прапаноўвалі свае паслугі па прыцягненні ў БДУ замежных грамадзян, але ў выніку мы ўжо больш за 5 гадоў супрацоўнічаем на рэгулярнай аснове толькі з адной кампаніяй. Яна зарэкамендавала сябе як адказны надзейны партнёр.

Самы першы этап: знайсці партнёра за мяжой для таго, каб ужо ў пэўным рэгіёне набіраць замежных студэнтаў. Наступны этап – пры спрыянні гэтых партнёраў распрацоўваць розныя механізмы для прыцягнення замежнікаў. І вось як адзін з механізмаў, нарадзілася ідэя стварэння такога цэнтра. Але цэнтр – яшчэ не канчатковы прадукт. Мы хочам зрабіць штосьці накшталт пляцовак БДУ, факультэта даўніверсітэцкай адукацыі за мяжой. Калі ёсць свая база, пляцоўка, тады прасцей распаўсюджваць інфармацыю пра ўніверсітэт, рэкламу ў рэгіёне. Цяпер мы хочам павялічыць і пашырыць дзейнасць цэнтра. Думаем над стварэннем механізма, які будзе працаваць на ўніверсітэт нават без нашага знаходжання ў Турцыі.

Як цяпер бачым, у турэцкім партнёру мы не памыліліся. Адкрыццё цэнтра ўжо дало свой плён. 31 мая ў БДУ прыехала група навучэнцаў ліцэя Profesor Dr Mumtaz Turhan Sosyal Bilimler Lisesi (г. Стамбул) у суправаджэнні двух выкладчыкаў. Мэтай візіту з'яўляецца азнаямленне з умовамі навучання ў БДУ, з факультэтамі і спецыяльнасцямі, навучальнымі праграмамі, умовамі пражывання ў інтэрнатах БДУ, а таксама знаёмства з культурай і традыцыямі нашай краіны. У будучыні, не выключана, навучэнцы дадзенага ліцэя прыедуць ва ўніверсітэт для атрымання адукацыі.

– Які ўнёсак зрабіў ФДА ў беларуска-турэцкі адукацыйны цэнтр, і чым абумоўлены выбар менавіта дадзенага рэгіёна для супрацоўніцтва?

– Зразумела, што асноўная маса фінансавых клопатаў кладзецца на партнёра. І не ўсе прэтэндэнты на гэта згодныя. Неабходнае досыць сур'ёзнае фінансавае ўліванне. Толькі зняць офіс, наняць персанал патрабуе немалых рэгулярных выдаткаў. На першапачатковым этапе ідэя не можа акупляцца. Для гэтага патрэбная рэгулярная плынь студэнтаў.

І для таго, каб вывесці такую структуру ў рэнтабельны стан, трэба папрацаваць працяглы перыяд часу. Наш партнёр верыць у будучыню супрацоўніцтва, таму ўзяў на сябе фінансавыя выдаткі. А мы забяспечылі метадычны і метадалагічны складнікі, прысутнічалі на адкрыцці, аснасцілі рэкламнымі матэрыяламі. Добрую падтрымку нам аказала пасольства Рэспублікі Беларусь у Турцыі.

Што да рэгіёна, Анталія была абрана не выпадкова. Гэта актыўны турыстычны рэгіён, дзе запатрабаваная руская мова. І, па нашай задумцы, спачатку пашырым працу інфармацыйнага цэнтра, а потым будзем далучаць адукацыйны складнік.

На базе гэтага прадстаўніцтва будзем адкрываць курсы рускай мовы для персаналу атэляў, для працаўнікоў сферы абслугоўвання. Мы плануем комплексны навучальны працэс: пэўны час гэтыя турэцкія грамадзяне навучаюцца ў сумесным інфармацыйна-адукацыйным цэнтры ў Турцыі, часткова – у краіне-носьбіце мовы (г. зн. у Беларусі).

Нярэдка інфармацыя пра навучанне распаўсюджваецца і па прынцыпе «сарафаннага радыё»: калі адзін чалавек павучыўся ў Беларусі, яму спадабалася, і ён распавёў знаёмым. Аднак распаўсюджанне інфармацыі будзе больш якасным, калі ў нас ёсць свае інфармацыйныя пляцоўкі за мяжой. Мы плануем падобнага кшталту структуры стварыць яшчэ і ў Кітаі, Паўднёвай Карэі. Была прапанова ад Туркменістана. Вельмі многае ў гэтай сітуацыі залежыць менавіта ад партнёра. Ад яго гатоўнасці да актыўнай працы і фінансавых укладанняў у дадзеную сферу.

– Якія захады ўвогуле робіць ФДА па прывабліванні замежных навучэнцаў?

– Сёлета плануецца істотнае павелічэнне колькасці турэцкіх грамадзян у параўнанні з 2014-м. Праца па рэкрутынгу замежных студэнтаў доўгачасовая. Немагчыма паехаць і набраць студэнтаў, як грыбоў у лесе. Гэта працяглы працэс. І, як паказала практыка, ён пачынае актыўна дзейнічаць толькі праз тры-чатыры гады.

На прыкладзе Паўднёвай Карэі пераканаліся, што, калі мы пачалі рэгулярна ездзіць на адукацыйныя выставы, наведваць карэйскія ВНУ, колькасць студэнтаў павялічылася ў сем разоў. Тое ж самае, я думаю, будзе і ў Турцыі. Спачатку мы ездзілі на адукацыйныя выставы. Цяпер мы адкрылі цэнтр, імкнёмся наведваць адукацыйныя ўстановы. І па кроплі наша дзейнасць пераўтворыцца ў своеасаблівы раўчук.

Па інфармацыі ад нашага турэцкага партнёра, ужо цяпер паступае шмат зваротаў. Але мы імкнёмся праводзіць адбор студэнтаў. А менавіта: запрашаць матываваных на вучобу, на атрыманне ведаў, якія ў далейшым будуць працягваць навучанне ва ўніверсітэце. Мы плануем не абмяжоўвацца навучаннем на курсах рускай мовы, а матываваць слухачоў на навучанне па паўнавартаснай праграме атрымання вышэйшай адукацыі ў БДУ.

– Распавядзіце, з якімі цяжкасцямі сутыкаюцца замежныя студэнты пры паступленні на ФДА?

– Па-першае, курсы рускай мовы ёсць не толькі ў БДУ. Канкурэнцыя нават сярод беларускіх ВНУ вельмі вялікая. А на міжнародным рынку дзяржавы распрацоўваюць цэлыя стратэгіі па прыцягненні на навучанне замежных студэнтаў. Па-другое, ёсць пэўныя складанасці ўзаемадзеяння з органамі па грамадзянстве і міграцыі. У асноўнай масе гэта, мабыць, апраўдана, таму што не ўсе замежнікі прыязджаюць сюды вучыцца. Але часам хацелася б большага разумення ад працаўнікоў праваахоўных органаў. Мы ж з імі выконваем адну агульную дзяржаўную задачу – стварэнне станоўчага іміджу Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне. У тым ліку і іміджу краіны з высокай якасцю адукацыі і бяспечным пражываннем. Ёсць пэўная неўрэгуляванасць дзейнасці па экспарце адукацыйных паслуг і ў заканадаўстве. І ў гэтай сітуацыі вельмі важная падтрымка кіраўніцтва ўніверсітэта. Менавіта адчуваючы яе, хочацца зрабіць яшчэ больш на карысць альма-матар.

– У вас вялікі вопыт супрацоўніцтва з Паўднёвай Карэяй…

– Кожны рэгіён вельмі своеасаблівы і спецыфічны. Адзін з сур'ёзных прарываў у сферы набору замежных грамадзян на навучанне ў нас адбыўся некалькі гадоў таму з Паўднёвай Карэяй. Мы змаглі атрымаць развіццё ў гэтым кірунку дзякуючы нашаму пасольству ў Рэспубліцы Карэя. Пазней наш актыўны ўдзел у выстаўнай дзейнасці і кантакты з ВНУ прынеслі плён: пачала распаўсюджвацца інфармацыя. Пэўна, адна з самых вялікіх праблем набору замежнікаў – гэта тое, што ў краінах, якія размешчаны далёка ад Беларусі, напрыклад, Карэя, Кітай, пра Беларусь вельмі мала ведаюць. Ведае нейкае вузкае кола людзей, у якіх знаёмыя ці сваякі бывалі ў Беларусі. Часта было на выставах такое, што падыходзілі і пыталі: «А што гэта за краіна, і дзе яна знаходзіцца?».

Таму асноўным было данесці інфармацыю: хто мы, дзе мы і што мы з сябе ўяўляем, якія ў нас магчымасці. А потым, калі пачалі прыязджаць студэнты, яны паглядзелі на ўмовы навучання, на нашу культуру, пазнаёміліся з нашымі выкладчыкамі і літаральна разрэкламавалі ФДА. Справа ў тым, што ў Паўднёвай Карэі моцна развітыя ўзаемаадносіны ў сацыяльных сетках. З гэтым звязана цікавая гісторыя. Звычайна з групай студэнтаў прыязджаюць выкладчыкі, застаюцца са студэнтамі два тыдні і з'язджаюць у Карэю. І вось мы сустрэліся праз некалькі дзён з кіраўніком адной з груп. А на наступны ж дзень студэнты ў сваіх сацыяльных сетках пачалі дзяліцца фатаграфіямі і водгукамі пра Беларусь. Як ім тут добра, спадабалася, чым яны задаволены. Гэта нават лепш за афіцыйную рэкламу, таму што, калі адзін аднаму мы штосьці раім, заўсёды мае большую вагу, чым афіцыйныя водгукі.

– Наколькі эфектыўная праца па наборы студэнтаў менавіта праз выставы?

– Спецыфіка працы на адукацыйных выставах такая, што не заўсёды магчыма атрымаць імгненны вынік. Часцей за ўсё неабходна прыязджаць на іх некалькі гадоў запар. Наведванне выстаў дае не хуткі, але доўгатэрміновы эфект. Акрамя таго адукацыйныя выставы – гэта пляцоўкі для абмену досведам у сферы маркетынгу адукацыйных паслуг, месца для ўсталявання новых кантактаў з рэкрутынгавымі агенцтвамі. З адным з такіх агенцтваў – Atlas – мы дамовіліся пра супрацоўніцтва падчас працы на адукацыйнай выставе ў г. Стамбул. Плануецца, што генеральны менеджар дадзенай кампаніі наведае ўніверсітэт. Падпісанне дамовы пра супрацоўніцтва з дадзенай кампаніяй істотна пашырыць магчымасці БДУ па наборы студэнтаў у турэцкім рэгіёне.

– У чым асаблівасці беларускай адукацыі для замежнікаў, і як яшчэ іх можна заахвоціць?

– У нас ёсць мноства ідэй па развіцці экспарту адукацыйных паслуг. Але вялікая частка з гэтых ідэй павінна праводзіцца на ўзроўні дзяржаўнай палітыкі. Бо ВНУ самі па сабе не могуць вырашыць усіх гэтых пытанняў, таму трэба адрозніваць тое, што можа зрабіць адна ВНУ, а што – уся сістэма адукацыі рэспублікі.

Калі будзе выпрацавана дакладная стратэгія дзейнасці ў галіне экспарту адукацыйных паслуг, тады, вядома, мы зможам значна ўзмацніць нашу канкурэнтаздольнасць у адносінах да іншых краін. Цяпер у Беларусі вобраз спакойнай і чыстай краіны з высокай якасцю адукацыі, з гасціннымі людзьмі і прыгожай прыродай. Усё гэта фарміруе станоўчы імідж. Але, акрамя гэтага, ёсць шмат іншых момантаў, якія таксама важныя для студэнтаў і іх бацькоў.

Напрыклад, у Расіі ёсць цэлы шэраг стыпендый для замежных грамадзян на атрыманне адукацыі. Я думаю, што некаторую колькасць замежных студэнтаў-бясплатнікаў магла б сабе дазволіць і Беларусь. Гэта добры сродак пашырэння геапалітычнага ўплыву і своеасаблівая рэклама сістэмы адукацыі Беларусі. Калі мы дадзім на буйныя краіны (такія як Турцыя, Кітай, Туркменістан) па пяць-дзесяць бясплатных месцаў для навучання, то ў выніку мы атрымаем значна больш, чым выдаткуем. Ёсць яшчэ шмат розных ідэй, якія неабходна рэалізоўваць не адной ВНУ, а дзяржаве ў цэлым.

Гутарыла
Фаіна НАКАНЕЧНАЯ

HI-TECH

Карту з інтэлектам прэзентавалі ў БДУ

Цырымонія падпісання дамовы пра выпуск першай партыі шматфункцыянальных інтэлектуальных пасведчанняў супрацоўнікаў БДУ адбылася 4 чэрвеня.

Сяргей Абламейка (БДУ) і Генадзь Сысоеў (Белінвестбанк)

Новае пасведчанне распрацавана спецыялістамі БДУ, ААТ «Белінвестбанк» і групай беларускіх прыватных кампаній на аснове міжнароднай карты Master Card.

Дадзеная ўнікальная пластыкавая карта аб'ядноўвае ў сабе тры функцыі. Па-першае, гэта ідэнтыфікацыйнае пасведчанне, на якое наносяцца фатаграфія і тэкст. Па-другое, гэта магчымасць электронна-лічбавага подпісу, з дапамогай якога супрацоўнікі БДУ могуць падпісваць пэўнага кшталту дакументы. Таксама навінка будзе выкарыстоўвацца як зарплатная банкаўская карта, пасродкам якой можна ажыццяўляць плацяжы ў Беларусі і за мяжой.

Адзначым, радыёчастотная ідэнтыфікацыя выкарыстоўваецца ў БДУ з 2003 г. ва ўнутрыўніверсітэцкіх інфармацыйных сістэмах для арганізацыі прапускной сістэмы і размежавання доступу ў памяшканні. Тады ў БДУ быў укаранёны першы ў Беларусі інтэлектуальны студэнцкі білет на аснове высокіх тэхналогій.

Распрацоўка інтэлектуальнага пасведчання супрацоўніка БДУ – чарговы праект вядучай ВНУ краіны ў галіне аўтэнтыфікацыі фізічных асоб.

Па словах рэктара БДУ *Сяргея Абламейкі,* у перспектыве ў карту могуць заносіцца не толькі пашпартныя дадзеныя, але і медыцынская інфармацыя. Усе звесткі, якія тычацца стану здароўя чалавека, будуць захоўвацца не толькі ў паліклініцы, але і заўсёды мецца пры сабе, што можа спатрэбіцца ў надзвычайных выпадках.

Як адзначыў дырэктар картцэнтра ААТ «Белінвестбанк» *Вадзім Галоўчыц,* укараненне ўнікальных

карт сярод супрацоўнікаў ВНУ – пілотны праект, па выніках якога можна будзе казаць пра яго маштабаванне як на БДУ, так і на ўсю сістэму адукацыі.

Дырэктар ЦІТ БДУ *Юрый Варатніцкі* растлумачыў: «Мы хочам не толькі перавесці значную частку адміністрацыйнай дакументацыі ў электронны выгляд, але і даць магчымасць нашым выкладчыкам выстаўляць адзнакі ў электронным выглядзе, а студэнтам прад'яўляць дыпломныя, курсавыя працы, рэфераты, не раздрукоўваючы іх».

Інтэлектуальнае пасведчанне супрацоўніка БДУ – адзін з першых прыкладаў эфектыўнага выкарыстання дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы высокіх тэхналогій. Вопытны ўзор быў адзначаны дыпломам на міжнародным спецыялізаваным форуме TIBO–2014.

Першыя 100 пасведчанняў супрацоўнікі БДУ атрымаюць у чэрвені. У новым навучальным годзе плануецца пачаць масавае выкарыстанне новых дакументаў, якія з'яўляюцца носьбітамі электроннага лічбавага подпісу, што паскорыць працэс зацвярджэння навучальнай дакументацыі.

Над праектам каля года працавалі разам адразу пяць арганізацый. Подпісы пад дакументам паставілі рэктар БДУ Сяргей Абламейка, старшыня кіравання ААТ «Белінвестбанк» Генадзь Сысоеў, намеснік генеральнага дырэктара па навуцы і інавацыях ТАА «Софткклуб» Уладзімір Анішчанка, дырэктар ТАА «Інфакард» Таццяна Ясюкевіч, дырэктар ЗАТ «НТЦ Кантакт» Анатоль Цеплякоў.

Сяргей ШАФАЛОВІЧ

ДАСЯГНЕННІ

Новая хваля

Дванаццаць студэнтаў і магістрантаў БДУ ганараваны званнем лаўрэатаў XXI Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў.

Цырымонія адбылася 3 чэрвеня ў БДЭУ. У святочнай атмасферы маладых таленавітых даследчыкаў павіншавалі міністр адукацыі Беларусі Міхаіл Жураўкоў, прадстаўнікі НАН Беларусі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях нашай краіны і Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Беларусі.

Званне лаўрэатаў XXI Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў атрымалі 12 прадстаўнікоў БДУ: *Іван Рэзнікаў і Мікалай Малашчонак* – магістранты хімічнага факультэта, чацвёртакурснік фізічнага факультэта і магістрант гэтага факультэта *Міхаіл Якельчык і Таццяна Карніенка,* магістрант біялагічнага факультэта *Марыя Шавель,* магістрант і выпускнік юрыдычнага факультэта *Максім Жукаў і Сяргей Елісееў* адпаведна, выпускніца філалагічнага факультэта *Ірына Часнок,* выпускнік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі *Уладзімір Палуха,* выпускнік факультэта сацыякультурных камунікацый *Сяргей Беразюк,* пяцікурснік геаграфічнага факультэта *Усевалад Генін* і выпускніца факультэта сацыякультурных камунікацый *Вольга Калпінская.*

Усяго ў гэты дзень дыпломамі лаўрэатаў адзначаны 82 чалавекі з 29 устаноў вышэйшай адукацыі нашай краіны. Адзначым, на конкурс былі дасланы каля чатырох тысяч навуковых прац. У іх падрыхтоўцы прыняў удзел 3971 канкурсант. У прыватнасці, 375 даследаванняў былі распрацаваны ў суаўтарстве, напісаны па 2 працы ад 104 канкурсантаў, па 3 працы – 6 канкурсантаў. У шорт-лісце значацца нават 4 праекты, падрыхтаваныя двума аўтарамі – студэнтамі 6 курса Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Таксама падкрэслім, больш за 20 гадоў БДУ сумесна з Міністэрствам адукацыі нашай краіны з'яўляецца арганізатарам гэтага інтэлектуальнага спаборніцтва сярод студэнцтва Беларусі. Супрацоўнікамі Галоўнага ўпраўлення навукі БДУ распрацаваны адмысловы навучальна-метадычны дапаможнік, укаранёны інтэрактыўны сайт спаборніцтва, выдадзена 11 зборнікаў навуковых артыкулаў лаўрэатаў конкурсу і аўтараў прац першай катэгорыі.

Паводле інфармацыі ГУН

КОНКУРСЫ

Суісканне прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі ў 2015 годзе

Загадам рэктара БДУ ад 16 сакавіка 2015 года абвешчаны конкурс на прысуджэнне прэмій імя У. І. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук і А. Н. Сеўчанкі ў галіне прыродазнаўчых навук. Конкурс 2015 года праходзіць у намінацыі «Навука», у якой удзельнічаюць маладыя навукоўцы БДУ (дактары навук ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдаты навук – да 35 гадоў, навукоўцы без ступені – да 30 гадоў).

Для ўдзелу ў конкурсе на суісканне прэміі імя А. Н. Сеўчанкі 2015 года пададзена 2 працы, абедзве ў камітэт «Фізіка». Маладыя навукоўцы падалі па адной працы ў камітэт «Фізіка» і ў камітэт «Хімія».

Для ўдзелу ў конкурсе на суісканне прэміі імя У. І. Пічэты 2015 года таксама пададзена 2 працы: у камітэт «Філалогія і журналістыка» і ў камітэт «Гісторыя, філасофія і эканоміка». Маладыя навукоўцы падалі адну працу ў камітэт «Гісторыя, філасофія і эканоміка» і адну працу ў камітэт «Правазнаўства і міжнародныя адносіны».

Падрабязней чытайце на сайце *http://research.bsu.by/2015-pichet-sevchenko-awards-nominants/.*

Першы тур конкурсу завершыцца 30 чэрвеня.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

3 чэрвеня **Круглова Галіна Анатольеўна,** дацэнт кафедры паліталогіі
4 чэрвеня **Зорын Уладзімір Пятровіч,** загадчык НДЛ біяфізікі і біятэхналогіі
7 чэрвеня **Бурава Святлана Нікіфараўна,** дацэнт кафедры сацыялогіі
11 чэрвеня **Пятрова Наталля Сямёнаўна,** дацэнт кафедры дынамічнай геалогіі
11 чэрвеня **Рашэтнікаў Дзмітрый Георгіевіч,** намеснік дэкана факультэта міжнародных адносін
12 чэрвеня **Мячкоўскі Станіслаў Антонавіч,** прафесар кафедры аналітычнай хіміі
12 чэрвеня **Ламаносаў Уладзімір Аляксандравіч,** загадчык НДЛ фізічнай хіміі кандэнсаваных асяроддзяў
13 чэрвеня **Шавялёў Дзмітрый Леанідавіч,** дацэнт кафедры міжнародных адносін
15 чэрвеня **Чудоўская Алена Аркадзьеўна,** дацэнт кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій
17 чэрвеня **Асташка Дзмітрый Аляксандравіч,** загадчык кафедры арганічнай хіміі
18 чэрвеня **Кулеш Людміла Мікалаеўна,** дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу
28 чэрвеня **Хадасевіч Валерый Васільевіч,** дырэктар навукова-вытворчага РУП «Актыў БДУ»

АБ'ЯВЫ

ІНСТЫТУТ БІЗНЕСУ І МЕНЕДЖМЕНТУ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД

ДАЦЭНТАЎ кафедры менеджменту тэхналогій і факультэта «Вышэйшая школа бізнесу».

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ кафедраў лагістыкі, менеджменту тэхналогій, бізнес-адміністравання і факультэта «Вышэйшая школа бізнесу».

ВЫКЛАДЧЫКАЎ кафедры бізнес-камунікацый і факультэта «Вышэйшая школа бізнесу».

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: г.Мінск, вул. Маскоўская, 5, каб. 210, тэл. 2007863.
E-mail: oopruk@sbmt.by, www.sbmt.by.

ДА ЎВАГІ

Лета праходзіць хутка, а значыць ацяпляльны сезон не за гарамі. Толькі поўная гатоўнасць энергазабеспячальных арганізацый і спажыўцоў цеплавой энергіі да работы ў асенне-зімовы перыяд гарантуе цяпло і ўтульнасць у кожнай арганізацыі, у кожным офісе і доме.

Гатоўнасць спажыўца цеплавой энергіі і цеплакрыніц да працы ў асенне-зімовы перыяд вызначаецца з мэтай ацэнкі працы сістэмы цеплазабеспячэння, а таксама для выяўлення і ліквідацыі недахопаў, якія зніжаюць надзейнасць працы ва ўмовах паніжаных тэмператур вонкавага паветра.

Праверцы гатоўнасці да працы ў асенне-зімовы перыяд падлягаюць спажыўцы цеплавой энергіі ўсіх формаў уласнасці і падпарадкаванасці, уключаючы жыллёвы фонд, які знаходзіцца на іх балансе.

Непрыманне мер па падрыхтоўцы цеплавыкарыстальнага абсталявання для працы ў асенне-зімовы перыяд з'яўляецца правапарушэннем і цягне накладанне штрафу ў адпаведнасці з артыкулам 20.11 «Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях».

С.У.СТАСЕНКА,
начальнік раённай цеплатэхнічнай інспекцыі энерганагляду г. Мінска
В.М.СЫЧ,
галоўны механік БДУ

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

«У руху да прэстыжу. ВНУ СНД асвойваюцца ў глабальных рэйтынгах» – інтэрв'ю рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі – Штотыднёвая газета навуковай супольнасці «Пошук», poisknews.ru (22.05).

«Ікар свайго часу» – інтэрв'ю з рэктарам БДУ акадэмікам Сяргеем Абламейкам – «Звязда», zviazda.by (29.05).

«Студэнты БДУ ўвайшлі ў 20 наймацнейшых праграмістаў свету» – kv.by, megacat.by, Telegraf.by (21.05), Sb.by (22.05).

XXI Міжнародныя Кірыла-Мяфодзьеўскія чытанні прайшлі 26–27 мая ў БДУ – Sobor.by (19.05), Megacat.by (21.05), Sb.by, БелТА, 21.by (22.05).

Міжнародныя эксперты выпрабавалі 11 студэнцкіх стартап-праектаў БДУ – БелТА, АТН (БТ-1), 21.by, Мінск-24 ДОК, 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, радыё «Сталіца» (25.05), БТ-1 / Добрай раніцы, Беларусь! (26.05), zviazda.by, «Звязда» (04.06).

Вынікі ўступнай кампаніі ў Ліцэй БДУ – Sb.by, БелаПАН, 21.by, Tut.by, Megacat.by, Gorod214.by, Interfax.by (27.05), zviazda.by, «Звязда» (28.05), Regnum.ru (29.05).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

МЕРКАВАННЕ

Фундаментальная бібліятэка: погляд студэнта

Ні для кога не сакрэт, што становішча бібліятэк у сучасным грамадстве не самае лепшае. Калос культуры, які трывала стаяў не адну тысячу гадоў, у стагоддзе інфармацыйных тэхналогій займеў гліняныя ногі і пахіснуўся. Ніводны сацыяльны інстытут не папакутаваў у выніку інфармацыйнага буму так моцна, як бібліятэка. Навукоўцы наперабой спрачаюцца, чаму так адбылося, а бібліятэкарам даводзіцца выяўляць незвычайную вынаходлівасць, каб ізноў прыцягнуць у свае сцены людзей, перасычаных вольным доступам да любой інфармацыі ў глабальнай сетцы. Фактычна, ім даводзіцца нанова выбудоўваць адносіны з грамадствам, якое яшчэ зусім нядаўна востра мела патрэбу ў бібліятэцы, а сёння ўсё часцей адмаўляецца ад яе.

Эвалюцыйная тэорыя кажа, што ў складаных умовах выжывае толькі той, хто прыстасоўваецца, і менавіта на гэта цяпер накіраваны высілкі працаўнікоў Фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Прыстасавацца да рынку інфармацыйных паслуг, які ўвесь час змяняецца, было няпроста, але бібліятэкары з гэтым справіліся. Нядаўна адкрылася пасля рамонту абноўленая чытальная зала інфармацыйных рэсурсаў па навуцы і мастацтве. Хто б што ні казаў пра выміранне бібліятэк, гэта месца выклікала ў мяне вельмі сур'ёзныя ўражанні.

Па-першае, сёння тут шмат народу! Ніхто не папракне супрацоўнікаў бібліятэкі ў тым, што яны не ведаюць, як прыцягнуць чытачоў. Хтосьці працуе за камп'ютарамі, хтосьці праглядае свежую прэсу, хтосьці, схаваўшыся ад старонніх вачэй і ўладкаваўшыся ямчэй, глядзіць відэа на YouTube. Балазе хуткасць бясплатнага бесправоднага доступу да інтэрнэту ў гэтай зале гэта дазваляе лёгка! І ўсё адбываецца ў атмасферы цішыні і спакою, за якую я раней так шанаваў утульныя кавашопы, месцы паломніцтва сучаснай прагрэсіўнай моладзі.

Па-другое, работнікі Фундаментальнай бібліятэкі руйнуюць стэрэатыпны вобраз бібліятэкара, які трывала засеў у свядомасці людзей яшчэ з савецкіх часоў. Тут вас з усмешкай сустрэнуць маладыя сімпатычныя супрацоўніцы, ані не падобныя да класічнай «бабулі-ў-акулярах-і-вязанай-кофце». Іх зычлівасць і гатоўнасць дапамагчы выклікаюць да сябе прыхільнасць. Шмат у чым з-за такога стаўлення да наведнікаў хочацца прыйсці сюды зноў.

Па-трэцяе, у новай чытальнай зале я ўбачыў тое, што прымусіла мяне зноў паверыць у новае пакаленне. Гэта былі маладыя людзі, якія чыталі кнігі! Я не хачу сказаць, што сучасная моладзь зусім не чытае. Я проста ніколі да гэтага не бачыў цэлай групы маладых людзей, якія б чыталі папяровыя кнігі ў памяшканні, дзе працуе бясплатны Wi-Fi! Для чытання тут ёсць усё: асвятленне, атмасфера і цэлая процьма выдатных выданняў класікаў і сучасных аўтараў. На паліцах чакаюць сваіх чытачоў кнігі Дастаеўскага і Набокава, Джэймса Джойса і Уілкі Колінза, Джона Р. Р. Толкіна і Ніка Пярумава. У зале знойдуцца кнігі на любы густ. Пацешыла таксама наяўнасць паліцы буккросінгу. Калі хто не ў курсе, Bookcrossing – гэты міжнародны рух, закліканы папулярызаваць чытацкую культуру. Удзельнікі руху проста пакідаюць прачытаныя кнігі ў адмыслова пазначаных пунктах і выбіраюць сабе новыя з тых, што пакінулі іншыя. Рады, што рух пачаў развівацца і ў нашай краіне.

Увагу кожнага, хто ўваходзіць у чытальную залу, абавязкова прыцягвае тэхналагічны агрэгат, размешчаны на адным са столікаў непадалёк ад дзвярэй. Прыкмеціўшы групу зацікаўленых студэнтаў, якія ўважліва вывучалі яго канструкцыю, я падышоў бліжэй і высветліў што да чаго. Агрэгат на паверку апынуўся самым сучасным 3D-прынтарам вытворчасці CubeX. Пра такія да сёння мне даводзілася толькі чытаць! І ўжо ніяк я не думаў, што сустрэну гэты варты старонак твораў у жанры навуковай фантастыкі апарат у чытальнай зале бібліятэкі!

Напрыканцы хацелася б сказаць, што, седзячы ў зале інфармацыйных рэсурсаў па навуцы і мастацтве ФБ, я ўсвядоміў адну простую праўду: людзі не ідуць у бібліятэку не таму, што з ёй штосьці не так, а таму, што не ведаюць, што іх там чакае! Пабываўшы тут адзін раз, я вырашыў завітваць сюды часцей.

Сяргей АРЛОЎ

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

Платон ім сябар, але праўда даражэйшая

Навучэнцы Ліцэя БДУ Вячаслаў Верашчагін і Вячаслаў Войніч плённа паўдзельнічалі ў XXIII Міжнароднай алімпіядзе па філасофіі сярод школьнікаў, якая прайшла ў Эстоніі.

У спаборніцкую частку алімпіяды ўваходзіў конкурс эсэ. Аб'яднаўчай тэмай стаў «Феномен нязгоды ў культуры і філасофіі ў самых разнастайных яго варыянтах «Disagreements» (англ. рознагалоссе)», а абавязковай умовай з'яўляўся выбар мовы, якая мусіла быць замежнай для ўдзельніка.

Пра сэнс быцця мы пагутарылі з кандыдатам філасофскіх навук дацэнтам кафедры філасофіі культуры Андрэем ДУДЧЫКАМ.

– Андрэй Юр'евіч, што здабывае пераможца алімпіяды па філасофіі?

– Паколькі ў алімпіядзе ўдзельнічаюць прадстаўнікі розных краін з Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, Азіі, Афрыкі, то стаўленне будзе змяняцца ў залежнасці ад нацыянальнай спецыфікі. У цэлым, не толькі медаль ці дыплом, але і проста ўдзел у алімпіядзе лічыцца вельмі статусным і прэстыжным дасягненнем. У шматлікіх заходнееўрапейскіх краінах філасофія вывучаецца ў якасці асобнага прадмета ў школах. Дзеці нават іспыт здаюць, што ўлічваецца пры паступленні ва ўніверсітэт. Таму поспехі ў галіне філасофіі ў шэрагу краін з'яўляюцца добрай заяўкай на паступленне ў прэстыжную ВНУ. Прычым не абавязкова на філасофскую спецыяльнасць – філасофскія веды шануюцца як аснова для далейшай адукацыі ў галіне эканомікі, біялогіі, праграмавання і г. д. Да такой высновы можна прыйсці пасля зносін на міжнародных спаборніцтвах з удзельнікамі алімпіяды і выкладчыкамі. Дарэчы, некаторыя студэнты заканчваюць філасофскае аддзяленне, а потым атрымліваюць ступень у іншай галіне. Значыць падрыхтоўка ў гэтай сферы – добры падмурак для паспяховай адукацыі і кар'еры ў самых розных сферах.

– А якія справы ў нас?

– У Беларусі сітуацыя трохі іншая, бо прадмет «філасофія» ў школах не вывучаецца, іспыт не здаецца, і нейкіх фармальных пераваг, напрыклад, палёгкі пры паступленні, паспяховы ўдзел у алімпіядзе па філасофіі не дае. Тым не менш, сам факт таго, што школьнікі цікавяцца філасофіяй, здольныя напісаць эсэ на высокім узроўні на замежнай мове, сведчыць пра пэўны ўзровень падрыхтоўкі. Мы разлічваем, што паступова папулярызацыя алімпіяды па філасофіі, прызнанне яе вынікаў, у тым ліку і фармальнае, будзе ўзрастаць. Можна адзначыць і сувязь з поспехамі ў іншых дысцыплінах. Напрыклад, Вячаслаў Верашчагін, чыя праца атрымала пахвальны водгук на алімпіядзе па філасофіі, з'яўляецца пераможцам Рэспубліканскай алімпіяды па грамадазнаўстве. Таму, у любым выпадку, вывучэнне філасофіі будзе карысным.

– Ці існуе ў БДУ штаб па адборы ўдзельнікаў на міжнародныя спаборніцтвы па філасофіі?

– Карыстаючыся выпадкам, нагадаю: цяперашняй восенню, недзе ў кастрычніку–лістападзе, плануецца правядзенне чарговага адборачнага этапу міжнароднай алімпіяды па філасофіі. Сачыце за абнаўленнямі на сайце ФФСН у раздзеле «Філасофія для школьнікаў».

– Наколькі актуальная сёння ў моладзевым асяроддзі, скажам так, навука інтэрпрэтавання?

– Магчыма, гэта звязана са спецыфікай майго кола зносін, але з устойлівай цікавасцю да філасофіі я сутыкаюся досыць часта. Існуе вялікая колькасць мастацкіх твораў, коміксаў, відэароліка, камп'ютарных гульняў, прысвечаных ідэям тых ці іншых філосафаў. Вядома, гэта не зусім акадэмічная навука, якой займаюцца ва ўніверсітэце, але сам факт наяўнасці падобнай прадукцыі сведчыць пра сур'ёзную цікавасць да філасофіі. Дарэчы, гэта тычыцца не толькі моладзі. Часта такая цікавасць выяўляецца і ў больш сталых людзей, якія ўжо валодаюць пэўным жыццёвым досведам.

Пры гэтым хачу заўважыць: цікавасць і вывучэнне філасофіі не абавязкова азначаюць, што ў далейшым прыйдзецца займацца навуковай працай ці выкладаннем. Многія з людзей з філасофскай адукацыяй працуюць у самых розных сферах. У гэтым і заключаецца спецыфіка добрай філасофскай адукацыі: яна дапамагае самастойна і ўсвядомлена працаваць з ведамі, адаптоўвацца да сітуацыі, якая хутка змяняецца.

– Філосафамі нараджаюцца ці становяцца пад уплывам пэўных умоў?

– Многія з маіх калегаў не вельмі любяць выкарыстоўваць тэрмін «філосаф», магчыма, з прычыны крытычнага стаўлення да сябе і сваіх ведаў. Хутчэй, філосафамі можна назваць сапраўды выбітных мысляроў, чые ідэі істотна паўплывалі на развіццё чалавечай культуры: Арыстоцель, Кант і шматлікія іншыя. Сюды ж можна дадаць лад жыцця, стаўленне да свету і г. д. У гэтым сэнсе мы хутчэй тыя, хто займаецца філасофіяй у меру сваіх сіл. У такой фармулёўцы няма нічога крыўднага, бо цікавасць да філасофіі, на мой погляд, уласцівая практычна кожнаму чалавеку. У кагосьці яна выяўляецца відавочна, у кагосьці пакуль «дрэмле». І розныя акалічнасці могуць спрыяць, або, наадварот, перашкаджаць развіццю гэтай цікавасці.

Вядома, для паспяховых заняткаў гэтай навукай пажаданыя спрыяльныя ўмовы: знаёмства з адпаведнай літаратурай, наяўнасць камунікатыўнага асяроддзя – людзей, з якімі можна абмеркаваць пэўныя пытанні. Але ўсё ж важнейшы сам досвед філасофскага мыслення. З аднаго боку, досвед існуе ў вялікай колькасці інтэлектуальных стэрэатыпаў, догмаў, забабонаў, а з іншага – ажыццяўляецца па пэўных уласных правілах. Магу толькі прапанаваць нашым чытачам рана ці позна паспрабаваць самім вывучаць філасофію. Незалежна ад таго, дзе і як гэта будзе адбывацца – ва ўніверсітэцкай аўдыторыі, пры чытанні кнігі, у гутарцы, самнасам з сабой. Думаю, у любым выпадку будзе цікава і карысна.

Гутарыла
Жанна ВАСАНСКАЯ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

15 чэрвеня 2015 года
Падпісана да друку 11.06.2015 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by